УДК 81’42

# Паняцце неэкалагічнай камунікацыі

**Доўгаль Алеся Валер’еўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)
dovgal_av@m.msu.by

У артыкуле вызначаецца сутнасць паняцця неэкалагічная камунікацыя; раз-глядаюцца параметры экалагічная / иеэкалагічиая камунікацыі; адзначаюцца формы иеэкалагічиай камунікацыі ў іитэриэт-асяродку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

The article defines the essence of the concept of non-ecological communication; parameters of ecological/non-ecological communication are considered; the forms of non-ecological communication in the Internet environment are noted.
Ключавыя словы: лінгваэкалогія, экалагічная камунікацыя, неэкалагічная камунікацыя.
Keywords: linguistic ecology, ecological communication, non-ecological communication.

Як адзначаюць многія даследчыкі, сучасная навука ў цэлым характарызуецца арыентацыяй на фарміраванне экалагічнай парадыгмы. На тэарэтычным узроўні экалагічная парадыгма прадугледжвае распрацоўку мадэлі экалагічных паводзінаў і экалагічнай свядомасці, на практычным узроўні – укараненне “трэнду экалагічнасці” ў паўсядзённае жыццё (прадукты харчавання, лад жыцця, б’юці-індустрыя, архітэктура, дызайн, камунікацыя) [2, с. 192–193]. Таму ў лінгвістыцы канца XX – пачатку XXI стст. усё больш увагі надаецца пытанням экалогіі мовы. Мова стала разглядаецца як асяродак існавання чалавека, таму яна, як і прырода, адчувае моцны ўплыў людзей і падвяргаецца пэўным зменам, у тым ліку і небяспечным. Новы напрамак лінгвістычных даследаванняў, за якім замацоўваецца назва *лінгваэкалогія*, займаецца пытаннямі ўзаемадзеяння паміж мовай і яе карыстальнікамі. Лінгваэкалогія з’яўляецца памежнай дысцыплінай, якая перасякаецца перадусім з культурай маўлення, стылістыкай, сацыялінгвістыкай, лінгвакультуралогіяй, этналінгвістыкай, юрыслінгвістыкай, лінгваканфлікталогіяй.

А. П. Скавароднікаў вызначае лінгваэкалогію як навуку, “прадметам вывучэння якой з’яўляецца стан мовы як складанай семіятычнай сістэмы, абумоўлены якасцю асяроддзя яе існавання і функцыянавання (у тым ліку сацыяльнымі і іншымі экстралінгвістычнымі фактарамі, якія ўплываюць негатыўна або пазітыўна на моўную свядомасць соцыуму і, як следства, на мову і яе маўленчую рэалізацыю), і, адпаведна, спосабы і сродкі абароны мовы і маўлення ад негатыўнага ўздзеяння, з аднаго боку, і шляхі і сродкі іх узбагачэння і развіцця, з другога” [4, с. 207].

Тэрміны *экалагічная камунікацыя* vs *неэкалагічная камунікацыя* паступова замацоўваюцца ў сучаснай лінгвістычнай парадыгме. Як адзначаюць даследчыкі, “прастору неэкалагічнай камунікацыі складаюць любыя вербальныя / невербальныя сродкі, стратэгіі і тактыкі камунікатыўных паводзінаў, якія супярэчаць камунікатыўна-прагматычным і этыка-маўленчым нормам, зніжаюць камфортнасць маўленчых зносінаў, негатыўна ўплываюць на эмацыйнае здароўе чалавека” [3, с. 126].

Спецыялісты па лінгваэкалогіі вылучаюць параметры экалагічнасці / неэкалагічнасці маўлення [5, с. 25–26]. Да параметраў экалагічных зносінаў (карысных, здаровых) адносяцца наступныя: добразычлівасць,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

пазбяганне негатыўных ацэнак, ветлівасць, салідарызацыя, этычнасць, рэалізацыя адраснасці праз называнне імя партнёра, адбор стылістычных сродкаў у адпаведнасці з сітуацыяй, уменне слухаць, уменне не перабіваць, узаемная талерантнасць, стрымліванне негатыўных эмоцый, эмацыйная падтрымка, мэтазгоднасць маўлення і інш. Неэкалагічнымі (шкоднымі, хворымі) праявамі камунікацыі лічацца грубасць, выказванне зняваґі, грэблівага стаўлення, папроку, насмешкі, негатыўнай ветлівасці, залішняя катэгарычнасць, канцэнтрацыя на асабістым "я", перабіванні, нематываваныя "ты-зносіны", злоўжыванне запазычанымі словамі, недарэчная гульня слоў, наўмысная рытарычнасць, вербальны гвалт, парушэнне стылістычных нормаў і інш. З пазіцыі лінгваэкалогіі кожнае вербальнае паведамленне павінна валодаць тэрапеўтычным уздзеяннем, а не быць сродкам траўміравання адрасата.

Экалагічнымі з'яўляюцца тыя зносіны паміж людзьмі, якія можна вызначыць як камфортныя, эфектыўныя, бяспечныя, неканфліктныя, іх мэта – зрабіць працэс узаемадзеяння паміж камунікантамі прадуктыўным і прыемным. У такім выпадку шчырасць, ветлівасць, добразычлівасць, этычнасць становяцца важнымі складнікамі экалагічнасці маўлення. Аднак у сувязі з развіццём інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій і з'яўленнем віртуальнай рэальнасці чалавек мусіць адаптавацца да новага камунікатыўнага асяродку, які патрабуе гнуткасці і пастаяннага знаходжання ў інфармацыйнай плыні. Мяняюцца спосабы і формы камунікацыі, трансфармуецца мова як інструмент зносінаў. Гэта ў сваю чаргу прыводзіць да фарміравання новага тыпу камунікатыўнай асобы, якая стала прадуктам актыўнай віртуальнай жыццядзейнасці.

Да неэкалагічных тэндэнцый у мове інтэрнэт-зносінаў адносяцца жарганізацыя, вульгарызацыя, дэтабуізацыя інвектыўнай лексікі, дэвербалізацыя камунікацыі, што "сведчаць пра зніжэнне ўзроўню маўленчай культуры і дэградацыю маўленчых паводзінаў, а таксама інвалюцыю моўнай сістэмы" [1, с. 54].

Новая камунікатыўная інтэрнэт-прастора стварае ўмовы для новых форм неэкалагічнай камунікацыі, да якіх адносяцца, напрыклад, тролінг, флеймінг, эльфінг, кібербулінг і інш.

Тролінг уяўляе сабой правакацыйнае, часам ілжывае, зневажальнае выказванне з мэтай стварэння канфліктнай сітуацыі, дыскрэдытацыі прадмета маўлення, прыніжэння асобы або сацыяльнай групы па пэўнай прымеце. Адрасант адкрыта імкнецца прынізіць апанента, справакаваць на грубасць. Вынікам эфектыўнай маўленчай правакацыі (тролінгу) з'яўляецца флеймінг – агрэсіўная форма маўленчых паводзінаў, заснаваная на ўзаемным абмене негатыўнымі эмацыйна-ацэначнымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выказваннямі. Супрацьлеглай формай неэкалагічных паводзінаў з'яўляецца эльфінг – празмерная пахвала і кампліменты на адрас аўтара грубых правакацыйных выказванняў. Аднак такі гіпертрафіраваны кампліментарны стыль зносінаў пачынае ўрэшце раздражняць адрасата, што прыводзіць да дэстабілізацыі эмацыйнага стану апанента і канфлікту. Кібербулінг з'яўляецца формай сацыяльнага гвалту, які выражаецца ў сістэматычных агрэсіўных дзеяннях: запалохванне, распаўсюджванне чутак, унушэнне страху, сораму, бездапаможнасці і пад. Усе адзначаныя стратэгіі маўленчых паводзінаў з'яўляюцца канфліктнымі і дэвіянтнымі.

Такім чынам, экалагізацыя не толькі рэальнай, але і віртуальнай камунікацыі з'яўляецца актуальнай задачай сучаснай лінгваэкалогіі.

## Спіс літаратуры

1. Доўгаль, А. В. Неэкалагічныя тэндэнцыі ў інтэрнэт-камунікацыі / А. В. Доўгаль // Вестник МГЛУ. Сер. 1, Филология. – 2024. – № 3 (130). – С. 47–55.

2. Лобова, Т. Г. Экологизация общения в условиях «антропологической катастрофы» / Т. Г. Лобова, Н. Ю. Ражина, Е. Н. Маковецкая // Манускрипт. – 2020. – Т. 13. – Вып. 10. – С. 192–196.

3. Панченко, Н. Н. Правда и искренность в экологичной / неэкологичной коммуникации / П. П. Панченко // Научный диалог. – 2012. – № 12. – С. 124–135.

4. Сковородников, А. П. О предмете эколингвистики применительно к состоянию современного русского языка / А. П. Сковородников // Экология языка и коммуникативная практика. – 2013. – № 1. – С. 205–233.

5. Шаховский, В. И. Экологизация современной науки и параметры экологичного общения / В. И. Шаховский, С. Г. Солодовникова // Эмотивная лингвоэкология в современном коммуникативном пространстве / под ред. В. И. Шаховского. – Волгоград : Перемена, 2013. – С. 23–34.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова